АКЦЫІ




# ТОБОЙ ГОРЖУСЬ Я, БЕЛАРУСЬ!

Сёлета спаўняецца 35 гадоў незалежнасці Рэспублікі Беларусь. У сувязі з гэтым калектыў Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі далучаецца да тэматычнай інфармацыйнай акцыі «Тобой горжусь я, Беларусь!». У межах акцыі нашы сябры і калегі, сучасныя пісьменнікі Прынёманскага краю разважаюць пра тое, што для іх незалежнасць нашай сінявокай Радзімы.



Пераможца Абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі (А. Пашкевіч), лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Рэспублікі Беларусь у намінацыі «Найлепшы твор літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства», член Саюза пісьменнікаў Беларусі, літаратуразнаўца, літаратурны крытык **Аліна САБУЦЬ:**

***Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь для мяне:***

***– гэта ўсведамленне каштоўнасці мірнага неба над галавой і водару беларускага слова;***

***– гэта сцвярджэнне свайго «я» ў супольным «мы»;***

***– гэта ўсведамленне гістарычнай памяці і «сплачанага доўгу» перад дзяржавай за прадстаўленыя магчымасці сваёй рэалізацыі як Асобы ;***
***– гэта разуменне дыялогу «свайго» і «чужога», або, як сказаў П.Бітэль, «шануй чужое аж да пакланення, // сваё любі да самазабыцця»;***
***– гэта  гонар за нашы нацыянальныя сімвалы: бусел над «зямлёй пад белымі крыламі» і кужэльны сінявокі лён, «цвяток радзімы васілька» і блакіт беларускіх рэк і азёр, рарытэтныя слуцкія паясы і ўнікальную літару «ў» беларускага алфавіта...***

САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ

Ліпень, 2026